И. С. Федченко

# СЯРЭДНЯЯ ЛІТВА

Разгледжаны малавядомыя старонкі гісторыі ўтварэння і існавання Сярэдняй Літвы. У ходзе польска-савецкай вайны даволі важным пытаннем з'яўляліся спрэчныя тэррыторыі вакол Вільні, якія за пару гадоў пераходзілі з рук у рукі паміж Польшчай, Расіяй і Літвой. Перамовы аб тым, каму належыць гэта тэрыторыя вяліся паміж усімі дзейснымі бакамі і Лігай Нацый. 7 кастрычніка 1920 г. на перамовах у Сувалках была ўстаноўлена дэмаркацыйная лінія паміж польскімі і літоўскімі часткамі. 6 кастрычніка генерал Л. Жалігоўскі аддаў загад пра перамяшчэнне аператыўнай ваеннай групоўкі ў раён Воранава і Беняконяў за вызначаную сувалкаўскімі перамовамі дэмаркацыйную лінію. Ядро дывізій склалі часткі, сфармаваныя з выхадцаў з Вільні і Віленскага краю. Іх дзеянні павінны былі выглядаць як вяртанне законных гаспадароў у родны край. У гэты ж дзень у раён Эйшышак падышла дывізія добраахвотнікаў М. Касцялкоўскага. Раніцай 7 кастрычніка на нарадзе афіцэраў дывізіі Жалігоўскі абвясціў, што войска пад яго камандаваннем рушыць на Вільню, і патлумачыў ім сапраўдны характар акцыі. Да Вільні было 50 км. На першых кіламетрах ніякага супраціву не было, толькі каля мястэчка Яшуны, пры пераправе цераз Мерачанку, адбылася 2-хгадзінная бойка з літоўскім атрадам. Дарога на Вільню была адчыненая. Раніцай 9 кастрычніка на подступах да Вільні разгарэліся першыя сутычкі. Літоўскія часткі хутка былі разгромлены. Віленчукі, аб'яднаныя ў патрыятычныя суполкі, знутры горада аказвалі супраціўленне літоўскім войскам (камандаванне якіх прыняло рашэнне аб эвакуацыі), абстрэльвалі іх пры адыходзе. Да другой гадзіны дня літоўскія атрады пакінулі Вільню. Увечары таго ж дня генерал Жалігоўскі радыёграмай, адрасаванай урадам Польшчы, ЗША, іншых дзяржаў і Лізе Нацый, апавясціў аб тым, што салдаты родам з Віленскага краю адмовіліся падпарадкоўвацца Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму, ён прыняў камандаванне над імі і створаная Часовая выканаўчая камісія. Паўстанцы былі спыненыя літоўцамі толькі ў раёне Шырвінтаса. Польшча заявіла, што адбываецца беларуска-літоўскі канфлікт, да якога яна не мае ніякага дачынення. Аб утварэнні Сярэдняй Літвы апавяшчалі тры ноты, высланыя 12 кастрычніка 1920 г. генералам Л. Жалігоўскім ураду Польшчы ў Варшаве, ураду Літвы ў Коўне і дзяржавам Антанты. Першы з дэкрэтаў абвяшчаў, што паўстае новая дзяржава пад назвай Сярэдняя Літва са сталіцай у Вільні, з тэрыторыяй 15 тыс. кв. км і насельніцтвам, крыху большым за 1,5 мільёна чалавек. Гербам новай дзяржавы станавіўся шчыт з Арлом і Пагоняй. Ліга Нацый запатрабавала спынення баявых дзеянняў, умяшаўшыся ў момант, калі літоўскім войскам пасля ўдалых баёў пад Гедрайцамі (19 лістапада) і Шырвінтамі (21 лістапада) адкрывалася дарога на Вільню. Пры пасрэдніцтве кантрольнай камісіі Лігі Нацый 29 лістапада было складзенае замірэнне. Стварылася фармальна незалежная дзяржава пад назвай Сярэдняя Літва. Яе кіраўніком стаў генерал Л. Жалігоўскі. 17 снежня 1920 г. ваенная кантрольная камісія Лігі Нацый пазначыла нейтральную паласу ў 10 км, якая падзяляла Літоўскую Рэспубліку і Сярэднюю Літву. Сярэдняя Літва ў выніку цалкам ці часткова ахоплівала Ашмянскі, Свянцянскі, Троцкі, Віленскі, Браслаўскі і Лідскі паветы; яна займала каля 10 тыс. км$^2$ і налічвала 530 тыс. чал., 40% з якіх складалі беларусы. У першы перыяд існавання Сярэдняй Літвы ў сувязі з будучым плебісцытам Часовая выканаўчая камісія праводзіла ў адносінах да беларускага насельніцтва ліберальную нацыянальную палітыку. 9 кастрычніка 1920 г. у Вільні на нарадзе беларускіх дзеячаў, у якой прынялі ўдзел Б. Тарашкевіч, В. Іваноўскі, А. Луцкевіч і інш., было вырашана выкарыстаць спрыяльныя палітычныя абставіны для развіцця беларускай адукацыі і асветы. Па прапанове ўрада Тарашкевіч заняў пасаду старшага рэферэнта ў Дэпартаменце асветы. Вясной 1921 г. у краі дзейнічала 186 беларускіх школ. У канцы 1920 г. тут заснавана Барунская настаўніцкая семінарыя. У 1921 г. па ініцыятыве Тарашкевіча было створана Таварыства беларускай школы. Аднак хутка новы ўрад Сярэдняй Літвы прыступіў да ліквідацыі беларускай асветы. У 1922 г. колькасць беларускіх школ скарацілася да 29. Урад Сярэдняй Літвы абяцаў даць Віленшчыне аўтаномію і фінансава падтрымліваў беларускія нацыянальныя арганізацыі. На тэрыторыі Сярэдняй Літвы дзейнічала некалькі беларускіх арганізацый, прадстаўнікі груп рознай палітычнай арыентацыі, якія былі звязаныя з Беларуссю. Паводле дэкрэту № 1 ад 12 кастрычніка 1920 г. Вярхоўнага галоўнакамандуючага войскамі Сярэдняй Літвы Л. Жалігоўскага, вярхоўная ўлада прыналежала Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму, выканаўчая ўлада – Часовай выканаўчай камісіі. Улада камісіі залежала ад Жалі-

Библиотека БГУИР

гоўскага, паколькі ім вызначалася яе кампэтэнцыя і паўнамоцтвы. Старшынёй яе стаў спачатку В. Абрамовіч, прыхільнік польскалітоўскай федэрацыі. Сябрамі камісіі былі Л. Бабіцкі, браты Іваноўскія, Б. Тарашкевіч і іншыя.

Галоўнымі задачамі Часовай камісіі з'яўлялася забеспячэнне палітычнай і эканамічнай стабільнасці краю. Слабасць цэнтральнай улады Сярэдняй Літвы стала прычынай злоўжыванняў з боку мясцовай адміністрацыі і вайскоўцаў.

Апарат кіравання фармаваўся на падставе дэкрэту № 2 ад 12 кастрычніка 1920 г. Незадаволенасць насельніцтва дзейнасцю камісіі выклікала крызыс. Старшынёй рэарганізаванай камісіі новага складу стаў генэрал С. Макжэцкі. Пасля закулісных перамоў па ініцыятыве Ю. Пілсудскага дэкрэтам № 415 ад 21 кастрычніка 1921 г. генерал Жалігоўскі прызначыў старшынёй камісіі А. Мяйштовіча, а дэкрэтам № 419 перадаў яму ўсю вярхоўную ўладу ў Сярэдняй Літве. Асноўнай задачай Мяйштовіча было правядзенне выбараў у прадстаўнічы орган Сярэдняй Літвы – сойм, які павінен быў вырашыць яе лёс.

Жалігоўскі ў закліку 9 кастрычніка 1920 г. абвяшчаў, што яго мэта – скліканне ў Вільні прадстаўнікоў краю для выказвання праўдзівай волі насельніцтва. Аднак першапачаткова прызначаныя на 9 студзеня 1921 г. выбары былі адкладзеныя. 28 кастрычніка1921 г. была прызначаная новая дата выбараў у Часовы Сойм Сярэдняй Літвы – 8 студзеня 1922 г. Да ўдзелу дапускаліся сталыя жыхары Сярэдняй Літвы і выхадцы яе тэрыторыі. Сярод 12 выбарчых акруг 3 знаходзіліся на тэрыторыі Польшчы (Ліда, Васілішкі, Браслаў) і 2 на тэрыторыі Літвы (Шырвінты, Высокі Двор).

Афіцыйнае Коўна выступіла катэгарычна супраць народнага волевыяўлення, Літву падтрымала Савецкая Расія. Большасць літоўцаў па закліку лідараў літоўскага насельніцтва Сярэдняй Літвы выбары байкатавала. Да байкоту далучылася частка беларусаў і яўрэяў. У выбарах удзельнічала ўсяго 64,4% выбаршчыкаў (249 325 чалавек). З літоўцаў, якія мелі права галасу, прагаласавала 8,2%, з яўрэяў – 15,3%, з беларусаў – 41%. У віленскім сойме 77 мандатаў атрымалі палітычныя аб'яднанні, якія выступалі за поўную інкарпарацыю Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы, 22 – прыхільнікі аўтаноміі ў рамках польскай дзяржавы, 4 – прыхільнікі федэрацыі з Польшчай (Дэмакратычная партыя) і толькі 3 – прыхільнікі саюза з літоўскай дзяржавай (Народны саюз Адраджэння). Пасяджэнні сойма пачаліся 1 лютага 1922 г. На пасяджэнні 20 лютага (24 лютага) 1922 г. сойм 96 галасамі пры 6, якія ўстрымаліся (у некаторых выданнях лічбы адпаведна 101 і 3), прыняў рэзалюцыю аб безумоўным уключэнні Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы. Са студзеня 1921 г. антыпольскія сілы вялі падрыхтоўку да ўзброенага паўстання, якое мела на мэце перашкодзіць далучэнню Віленшчыны да Польшчы, аднак польская дэфензіва раскрыла падполле. 22 сакавіка 1922 г. устаноўчы сойм у Варшаве прыняў Акт уз'яднання Віленскага краю з Польскай Рэспублікай. 24 сакавіка 1922 г. віленскі сойм быў распушчаны (частка яго дэпутатаў была кааптаваная ў сойм Польскай Рэспублікі). 6 красавіка варшаўскім соймам быў прыняты закон аб усталяванні дзяржаўнай улады на Віленшчыне. 18 красавіка 1922 г. у Вільні пры ўдзеле кіраўніка дзяржавы Ю. Пілсудскага, прэм'ер-міністра А. Панікоўскага, прымаса Польшчы Э. Дальбора, генерала Л. Жалігоўскага адбылося ўрачыстае падпісанне акта аб усталяванні ўлады ўрада Польшчы. Рашэннем Лігі Нацый ад 3 лютага 1923 г. Віленскі край замацоўваўся за Польшчай. Перамовы паміж Літвой і Польшчай восенню 1925 г., у сакавіку-ліпені 1928 г. і ў наступныя гады ні да чаго не прывялі. 17 сакавіка 1938 года Польшча падала пры падтрымцы Германіі Літве ва ўльтыматыўнай форме шэраг патрабаванняў: усталяваць дыпламатычную, эканамічную і паштова-тэлеграфную сувязі і адмяніць артыкул канстытуцыі, якая паказвае, што сталіцай Літвы з'яўляецца Вільня, пагражаючы ў выпадку іх адхіленні акупаваць краіну. У сакавіку 1938 г. паміж Польшчай і Літвой былі ўсталяваныя дыпламатычныя адносіны. У верасні 1939 г. у ходзе вызваленчага паходу РККА статус Віленскай вобласці быў зменены. Па «дамове аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой» ад 10 кастрычніка 1939 г. большая частка Віленскага краю (тэрыторыя ў 6909 км$^2$ з 490 тыс. жыхароў) была перададзена Літве.


1. https://ru.wikipedia.org/wiki/Советско-польская_война
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/Виленский_вопрос



*Федченко Илья Сергеевич,*, студент ФКП, *fis95@mail.ru*
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,*, зав.каф. гум. дисц., к.и.н., доцент


Библиотека БГУИР